# ВЫХАВАННЕ ХЛОПЧЫКА Ў ТРАДЫЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ БЕЛАРУСАЎ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XX СТ.)
# RAISING A BOY IN A TRADITIONAL BELARUSIAN SOCIETY (SECOND HALF OF THE XIX – FIRST HALF OF THE XX CENTURY).

Алеся Якубінская,
Мінск, Беларусь

Ключевые слова: детство, традиционное воспитание, социализация, белорусские крестьяне, “школа пастушества”.

Резюме. В статье проведён анализ этнографических и фольклорных материалов второй половины XIX – первой половины XX в., выделены основные аспекты и определены характерные особенности воспитания мальчика в традиционном обществе белорусских крестьян.

Keywords: childhood, traditional parenting, raising, socialization, Belarusian peasants, “school of pastoralism”/

Resume. The article analyzes ethnographic and folklore materials of the second half of the XIX – first half of the XX century, the main aspects are highlighted and characteristic features of raising a boy in a traditional society of Belarusian peasants are determined.

Важнай часткай культуры кожнага этнасу з’яўляецца працэс уваходжання чалавека ў культуру, бо так забяспечваецца пераемнасць пакаленняў. Выхаванне чалавека ў межах пэўнай супольнасці адбываецца праз перадачу калектыўнага вопыту і традыцыйных культурных каштоўнасцей. У першым перыядзе жыццёвага цыклу чалавека – перыядзе дзяцінства – пераемнасць пакаленняў забяспечваецца пры дапамозе традыцыйных спосабаў і сродкаў сацыялізацыі і народных метадаў выхавання. Выхаванне дзяцей у межах пэўнага грамадства вызначаецца, у першую чаргу, трансляцыяй ім пэўнага культурнага вопыту, сфарміраванага на “стрыжнёвых” маральных, духоўных каштоўнасцях гэтага грамадства. Працэс сацыялізацыі чалавека пачынаецца з моманту нараджэння і працягваецца ўсё жыццё, ён суправаджаецца зменай яго сацыяльных статусаў, якія фарміруюць асобу чалавека. Перадача традыцыйных культурных каштоўнасцей можа ажыццяўляцца мэтанакіравана пад час выхаваўчага працэсу, а таксама пад уплывам асяроддзя той культуры, у якую ўключаецца чалавек. У традыцыйным грамадстве беларусаў метады і прыёмы народнай педагогікі шчыльна перапляталіся з традыцыйнымі спосабамі і сродкамі сацыялізацыі на першым этапе жыццёвага цыклу чалавека – перыядзе дзяцінства. Напрыклад, існавалі мэтанакіраваныя метады народнай педагогікі: прыклад, аўтарытэт, парада, унушэнне, заахвочванне, перакананне, прывучанне, практыкаванне, выпрабаванне, спаборніцтва, асуджэнне, пакаранне. Такім чынам, паняцці «сацыялізацыя» і «выхаванне» з’яўляюцца сінонімамі ў дачыненні да перыяду дзяцінства, бо фактычна азначаюць працэс уваходжання дзяцей ў культуру праз засваенне пэўных сацыяльных ролей і традыцыйных каштоўнасцей таго грамадства, ў якое яны ўключаюцца.

Выхаванне (сацыялізацыя) дзяцей звычайна адбываецца ў межах сям'і, у асяроддзі дзіцячай суполкі, пад уплывам грамадскіх традыцый. Сістэма стрыжнёвых каштоўнасцей можа мець свае асаблівасці ў залежнасці ад полу чалавека, таму мэтазгодна разглядаць працэс сацыялізацыі хлопчыка асобна, што дазволіць сфармуляваць гендэрныя асаблівасці адаптацыйнай стратэгіі супольнасці.

Асноўнай мэтай выхавання хлопчыка ва ўзросце ад нараджэння да 6 – 8 гадоў было фарміраванне паўнавартаснага члена сялянскай супольнасці шляхам яго далучэння да здаровага ладу жыцця. Таму асноўнымі спосабамі і сродкамі сацыялізацыі ў гэтым узросце з'яўляліся традыцыйныя спосабы і сродкі забеспячэння здароўя дзяцей: культура кармлення і харчавання, спецыяльная вопратка немаўлят, спосабы прафілактыкі і лячэння дзіцячых хвароб, спосабы і сродкі для авалодання дзецьмі тэхнікай цела. Традыцыйныя спосабы і сродкі забеспячэння здароўя дзяцей былі аднолькавыя і для хлопчыкаў, і для дзяўчынак. Невялікія адрозненні існавалі толькі ў нашэнні дзецьмі пояса: хлопчыкі насілі пояс амаль на сцёгнах, як дарослыя мужчыны. Першая змена сацыяльнага статуса хлопчыка маркіравалася рэшткамі сямейных пераходных абрадаў – "разразанне путцаў" (калі дзіця пачынала хадзіць), "пастрыжыны" (абрад першага падстрыгання валасоў ва ўзросце каля года). Другая змена сацыяльнага статуса хлопчыка адбывалася ва ўзросце двух – трох гадоў, што адзначалася зменай месца ў жыллёвай прасторы сялянскай сям'і: дзіця пакідала калыску, займала печ, "палок", далучалася да старэйшых братоў і сяцёр, тым самым уключаючыся ў дзіцячую суполку.

Асноўнай мэтай выхаваўчага працэсу другога перыяду дзяцінства (узрост ад 6 – 8 да 12 – 14 гадоў) было фарміраванне ў хлопчыкаў мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі, якая павінна была забяспечваць набыццё адпаведнай сацыяльнай ролі. Тут асаблівую ролю адыгрываў памежны ўзрост 6 – 8 гадоў, калі дзеці канчаткова ўсведамлялі сваю палавую прыналежнасць, што выражалася ў саманазве. Так, хлопчыка ўжо не называлі агульным тэрмінам "блазнота", які адносіўся і да дзяўчынак папярэдняй узроставай групоўкі, а "блазн", "блазнішка", што падкрэслівала яго палавую прыналежнасць. Этымалогія слова "блазн", згодна са слоўнікам У.М. Дабравольскага, вызначаецца як няцямлівы, глупы, дурачок, гарэза [3, с.29]. Такая назва, па-першае, вызначае асаблівасці паводзінаў, характэрных дзецям у гэтым узросце (дураслівасць, гарэзлівасць). Па-другое, такая назва падкрэслівае традыцыйны погляд сялян на дзяцей, якія, паводле ўяўленняў сялян, яшчэ не маюць розуму. Таксама у беларускіх сялян захаваліся рэшткі пераходных абрадаў, звязаных са зменай "малочных" зубоў на карэнныя, абрады развязвання пупавіны, як сімвала развязвання розуму, і, нарэшце, абрад апранання хлопчыкам першых уласных штаноў. Такім чынам, можна адзначыць, што ва ўзросце 6 – 8 гадоў хлопчык сімвалічна "развітваўся" з папярэднім становішчам, адбывалася фіксацыя яго палавой прыналежнасці.

З умацаваннем палавой дыферэнцыяцыі паводзінаў звязаны таксама выбар напрамкаў далейшай дзейнасці хлопчыка. У хлопчыкаў, як адзначае

П.В.Шэйн, з 7 год пачынаўся "пастухоўскі век" [7, с.10]. Дзецям другога перыяду дзяцінства бацькі давяралі пасвіць больш дробную хатнюю жывёлу, напрыклад, свіней ці коз. Некаторыя хлопчыкі з бедных сем'яў наймаліся ў падпаскі да больш заможных сялян. Гэты занятак лічыўся цяжкім, да таго ж праца падпаска вельмі танна каштавала. У.М. Дабравольскі ў слоўніку дае наступнае вызначэнне тэрміну "падпасак" – гэта "хлопчык або дзяўчынка дзесяці – дванаццаці гадоў, памочнік пастуха" [3, с.630]. Такім чынам, калі ў сем год хлопчык пачынаў атрымоўваць навыкі пастухоўскай справы, то ў дзесяць – дванаццаць год ён ужо мог мець сваю першую "прафесію", за якую атрымліваў плату, што павялічвала яго ролю ў сям'і. Гэты абавязак пэўным чынам вызваляў хлопчыка ад хатніх спраў, што, верагодна, спрыяла і яго паступоваму вызваленню з-пад матчынага ўплыву. Уплыў бацькі на сына ўзрастаў, бо ён пачынаў прывучаць хлопчыка да мужчынскіх спраў па-за межамі сям'і.

Хлопчыкаў-падлеткаў у традыцыйным грамадстве беларускіх сялян называлі "парабак", "пахолак", верагодна такая назва адзначае іх гатоўнасць да дарослай працоўнай дзейнасці. Удалося зафіксаваць ужыванне жанчынай сталага веку назвы "урубак" у дачыненні да хлопчыка, які вылучаўся ростам і сілай сярод сваіх сяброў у дзіцячай суполцы [1, с.7]. Магчыма, такая назва з'яўляецца ўтваральнай ад назвы "парабак". Хлопчыкі ва ўзросце пяці – сямі год пачыналі адыходзіць ад хатніх спраў, паступова пазбаўляючыся з-пад псіхалагічнага ўплыву маці. І.С.Кон адзначае, што ў традыцыйным грамадстве на хлопчыкаў аказваюць больш моцны ціск і часцей прымяняюць пакаранні, але іх і часцей хваляць, і даюць ім большую аўтаномію ў развіцці [5, с.196]. Сапраўды, народная мудрасць сведчыць: "На хлапца не шкадуй дубца" або "Плача Юрка, бо свярбіць шкурка" [6, с.135-136]. Важным момантам сацыяльнага сталення можна лічыць удзел дзяцей у працах, якія выконваліся разам ўсёй сям'ёй, грамадой, бо, уключаючыся ў грамадскія работы, працуючы на роўных умовах з дарослымі, дзеці павышалі свой сацыяльны статус і значэнне.

Вырашальнае значэнне ў сацыяльным сталенні хлопчыка мела гульнявая культура і група сяброў. Гульні хлопчыкаў вылучаліся большай вонкавай накіраванасцю, чым гульні дзяўчынак, што было звязана з дзейнасцю так званай "школы пастухоўства" – культурнага феномена, накіраванага на фарміраване ў хлопчыкаў мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі: мужчынскай свядомасці і адпаведных паводзінаў, актыўнай сацыяльнай ролі [8, с. 98]. Узрастала роля бацькі ва ўплыве на сыноў, які імкнуўся прыцягваць іх да мужчынскіх спраў па-за межамі сям'і. Такой першай справай быў абавязак пасвіць спачатку гусей, коз, авечак, а потым і кароў, коней. Менавіта на пасьбе складваўся своеасаблівы мікраклімат хлапечай суполкі, які нараджаў адпаведныя гульні, якія мелі больш спартыўна-спаборніцкі характар, але элементы імітацыі захоўваліся. Аналіз пастухоўскай гульні "Каза" дазволіць вылучыць пэўныя рысы гульнявай сацыялізацыі хлопчыкаў [4, с.43-44]. На пачатку гульні хлопчыкі абіраюць "пастуха" пры дапамозе спецыяльнага спаборніцтва: шырока расставіўшы

ногі, кідаюць праз іх свае шапкі, чыя шапка ўпадзе бліжэй – той “пастух”. Дзеці складаюць свае шапкі-козы каля ўбітага ў зямлю калка і “пастух” іх “пасе” – сцеражэ. Астатнія павінны “ўкрасці коз”, пакуль ”пастух” не паспеў стукнуць іх пугай. А калі тры “казы ўкрадзены”, пастуха-небараку гоняць праз “шых”: той павінен прапаўзці паміж ног астатніх на каленях, атрымаўшы ад кожнага некалькі ўдараў шапкай. Такім чынам, нельга не заўважыць, што кожны кампанент гульні падкрэсліваў справядлівасць яе вынікаў: выбар пастуха пры дапамозе спаборніцтва, пакаранне прагонам праз “шых” за “пакрадзеных коз”. Імкненне да мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі падкрэслівалася тым, што згубіць шапку – значыць згубіць свой прэстыж. Да таго ж спартыўна-спаборніцкі характар гульні фарміраваў ў свядомасці хлопчыкаў мужчынскія сацыяльныя каштоўнасці: імкненне да лідэрства, неабходнасць выконваць свой абавязак, як мага лепш, бо ў іншым выпадку цябе чакаюць негатыўныя вынікі і, безумоўна, садзейнічаў набыццю працоўных навыкаў пастуха.

Асаблівасць сацыяльных паводзін хлопчыкаў у межах суполкі заключалася ў актыўным выкарыстанні імі твораў фальклору – дражнілак прыгавораў, небыліц. У агульным рэчышчы народнай смехавай культуры знаходзіліся дражнілкі з супрацьпастаўленнем асоб па полаўзроставай прыкмеце і адпаведным размеркаванннем умоўных дароў:

Дабы-дабы,
Дзеўкам – жабы,
Тыры-тыры,
Хлопцам – сыры! [2, с.387]

Цікава, што большасць такіх дражнілак скіравана на высмейванне дзяўчынак і падкрэсліванне перавагі хлопчыкаў. Дадзеная акалічнасць абумоўлена фарміраваннем у хлапечай свядомасці ўяўлення аб больш актыўнай мужчынскай сацыяльнай ролі ў грамадстве, як ужо адзначалася вышэй. Магчыма, частка падобных дражнілак была запазычана з фальклору дарослых, аб чым сведчаць лексемы “хлопцы” і “дзеўкі”, якія адсылаюць нас да шэрагу твораў, уласцівых абрадавым пікіроўкам моладзі падчас, напрыклад, Купалля і Масленіцы.

Некаторыя дзіцячыя песні маюць яскравую гендэрную скіраванасць. У іх дакладна пазначаюцца сацыяльныя ролі, напрыклад хлопчыка, прычым на працягу яго сталення:

Слава Богу і Хрысту,
Што я хлопчыкам расту:
Я ігрэц у ражок,
Я для быдла пастушок,
Я на лузе касец,
Я для качара стралец
І для дзевак маладзец [2, с.344].

Такім чынам, вершаваныя творы дзіцячага фальклору з’яўляюцца важнай часткай камунікатыўнага вопыту дзяцей. Існаванне традыцыі забяспечвалася трансляцыяй твораў ад старэйшых да малодшых, спрыяючы

больш хуткай сацыялізацыі дзіцяці праз прадастаўленне яму ўжо гатовых славесных формул, неабходных для самаідэнтыфікацыі, усведамлення свайго месца ў суполцы, вырашэння пэўных праблем, выхаду з канфліктных сітуацый.

Такім чынам, своеасаблівыя стэрэатыпы паводзінаў хлопчыкаў залежалі ад іх сацыяльнага вопыту, які набываўся ў працэсе ўключэння іх у грамадства. Дзейнасць традыцыйных спосабаў і сродкаў сацыялізацыі фарміравала паводзіны хлопчыка адпаведна мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі, якая адлюстроўвалася ў культурным феномене традыцыйнага грамадства "школе пастухоўства".

Літаратура


1. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 138.
2. Дзіцячы фальклор / Склад., уступ. арт. Г. А. Барташэвіч; рэдкал. В. К. Бандарчык [і інш.]; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 734 с.
3. Добровольский, В. Н. Смоленский областной словарь / В. Н. Добровольский. – Смоленск : Тип. П. А. Силина, 1914. – 1022 с.
4. Казлоўшчык, Ул. Аб фізічным выхаванні ў беларусаў / Ул. Казлоўшчык. – Вільня : Выд-ва "Беларуская крыніца", 1928. – 126 с.
5. Кон, И. С. Ребёнок и общество: историко-этнографическая перспектива / И. С. Кон. – М. : Глав. ред. восточной литературы изд-ва «Наука», 1988. – 269 с.
6. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / рэдкал. В. К. Бандарчык [і інш.]. – Кн. 1. / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 559 с.
7. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / П. В. Шейн. – Т.1. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – Спб. : Тип. Императорской Академии наук, 1887. – 585 с.
8. Якубінская, А. Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст. / А. Дз. Якубінская. – Мінск : РІВШ, 2010. – 118 с.